**ВО́ЙЦІК** Віктар Антонавіч (н. 3.9. 1947, г. Гродна), кампазітар. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1995). Скончыў Бел. кансерваторыю (1972). З 1980 выкладае ў Бел. акадэміі музыкі. У яго творчасці сучасная кампазітарская тэхніка арганічна спалучаецца з элементамі бел. фальклору. Фалькл. інтанацыйнасцю прасякнуты кантата «Як хадзіў камар у сваты», сімфонія «Каложа» (абедзве 1972). Прысвечаная Р.Шырме кантата «Казацкія песні» на нар. словы (1974) заснавана на свабоднай інтэрпрэтацыі песень казацкай вольніцы. Аркестравая сюіта «Забавы» (1976) увасабляе карнавальна-гульнявыя моманты бел. каляднага абраду. У санаце для двух цымбалаў (1979), варыяцыях «Саўка ды Грышка» (1980), цымбальным канцэрце (1988) раскрыты багатыя магчымасці нар. інструмента, паказана сувязь яго тэмбравага каларыту з нар. вобразнасцю.

*Літ.:* Белорусская музыка 1960—1980-х гг. Мн., 1997; Мдзівані Т.Г., Сергіенка Р.І. Кампазітары Беларусі. Мн., 1997.

*К. С. Бандарэнка.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ